БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
КАНЦЭРН ПА НАФЦЕ І ХІМІІ

Пр-т Дзяржынскага, 73, 220116, г.Мінск

E-mail: koncbnx@belneftekhim.by

Тэл.:(017)269-01-01, тэл./факс (017)277-10-08
Тэлетайп 252303 TANK BY

Р/с № BY46AKBB30120915600156000000
у ААТ «ААБ Беларусбанк» », г.Мінск,
пр-т Дзяржынскага, 18, код AKBBBY2X

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
КОНЦЕРН ПО НЕФТИ И ХИМИИ

Пр-т Дзержинского, 73, 220116, г.Минск

E-mail: koncbnx@belneftekhim.by

Тел.:(017)269-01-01, тел./факс (017)277-10-08
Телетайп 252303 TANK BY

Р/с № BY46AKBB30120915600156000000
в ОАО «АСБ Беларусбанк», г.Минск,
пр-т Дзержинского, 18, код AKBBBY2X

09.04.2021 № 07-01/1/Б-21
На № _______ ад ___________

Аб разглядзе звароту

Канцэрн «Белнафтахім» разгледзеў Ваш зварот ад 25.03.2021 і паведамляе, што лістом ад 10.05.2019 № 07-01/Б-61 Вы былі праінфарміраваны пра фактары, якія аказваюць уплыў на кошт маторнага паліва.

Дадаткова ў **частцы залежнасці цаны маторнага паліва ад цаны нафты** інфармуем, што ў структуры сабекошту вытворчасці нафтапрадуктаў, у тым ліку і маторнага паліва, нафта займае да 90 працэнтаў. Сабекошт вытворчасці нафтапрадуктаў, акрамя гэтага, фарміруецца з улікам кошту энергарэсурсаў, каталізатараў, прысадак, іншых матэрыяльных рэсурсаў, большасць з якіх закупляюцца за валюту.

Што тычыцца Вашага пытання **аб зніжэнні кошту на паліва ў перыяды зніжэння сусветных катыровак нафты**, то на прыкладзе 2020 года можна ўбачыць, што кошт на маторнае паліва як павышаўся ў І і IV кварталах у перыяды росту катыровак, так і зніжаўся ў II квартале ў перыяды іх паніжэння. Дынаміка цэн у Рэспубліцы Беларусь у гэты перыяд мела аналагічны трэнд, як і ў сумежных дзяржавах.

Стратэгія паэтапнага змянення цэн на маторнае паліва, якая рэалізуецца канцэрнам, накіравана на зніжэнне адчувальнасці да зменаў цаны на нафту, ваганняў курсаў валют, папярэджанне значных скачкоў цэн пры рэзкай змене кан'юнктуры нафтавага рынку.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў» пры нязгодзе з дадзеным адказам Вы маеце права абскардзіць яго ў судовым парадку.

Намеснік старшыні канцэрна С.Р.Гурына

Дудкіна 269-02-26